

**БРОВІКАЎ**
**Уладзімір Ігнатавіч**
**БРОВИКОВ**
**Владимир Игнатьевич**

Пінская — Заходняя выбарчая акруга № 194 Брэсцкай вобласці.

Нарадзіўся ў 1931 г. Беларус. Член КПСС з 1958 г. Адукацыя вышэйшая — закончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна і Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. Кандыдат філасофскіх навук.

З 1955 г. знаходзіўся на журналісцкай рабоце ў Віцебскай вобласці — рэдактар суражскай і аршанскай раённых газет, міжраённай газеты «Дняпроўская праўда» і аб'яднанай аршанскай газеты «Ленінскі прызыў». З 1963 г.— намеснік сакратара парткома Аршанскага вытворчага калгасна-саўгаснага ўпраўлення, а з 1965 г.— другі сакратар Аршанскага райкома Кампартыі Беларусі. З 1969 г.— рэдактар абласной газеты «Віцебскі рабочы», затым сакратар Віцебскага абкома Кампартыі Беларусі.

У 1972—1978 гг. працаваў на адказных пасадах у апараце Цэнтральнага Камітэта КПСС, з іх больш пяці гадоў — намеснікам загадчыка аддзела арганізацыйна-партыйнай работы.

У 1978 г. выбраны другім сакратаром ЦК Кампартыі Беларусі.

Член Бюро ЦК Кампартыі Беларусі.

Член Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР.

Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР.

Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР дзевятага склікання.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы